# Уплецена ў само жыццё

## З саломы нашы продкі выраблялі і гаспадарчыя прылады, і сапраўдныя шэдэўры, якія папоўнілі сусветную скарбніцу мастацкіх каштоўнасцей

**На саломе спалі і хату ёй насцілалі, з яе рабілі лапці і капелюшы, нават у пасаг яе давалі. Нездарма звычайных беларусаў лапцямі ды саламянікамі называлі. І выслоўе «гнецца, як салома пад ветрам» – пра іх жыццё, якое гнула-выпрабоўвала войнамі, голадам, цяжкай працай.**

Сёння варта ганарыцца жыццяздольнасцю, творчай кемлівасцю і майстэрствам нашых папярэднікаў. Многія з іх не мелі не тое што спецыяльнай – нават пачатковай адукацыі, але змаглі ўразіць вытанчаную Еўропу ігрой на саламяных цымбалах, акладамі для царкоўных абразоў, царскімі варотамі і іншымі рэчамі з саломы, якія і дагэтуль выклікаюць захапленне і здзіўляюць сваёй прыгажосцю і непаўторнасцю.

### Салома ад жыта, а жыта – святое

Вечар, жнівень… Стомленае, убранае камбайнамі поле. На ім залацістыя скірды саломы, а ў паветры

**Салома мела важнае значэнне ў жыцці нашых продкаў**



Фота ілюстрацыйнага характару

яе непаўторны пах. Здаецца, што з гэтым адмысловым водарам знітавана ўсё тваё жыццё, хаця і не жывеш у вёсцы, не працуеш у сельскай гаспадарцы. Магчыма, гэта якраз тое, што перадалі разам з генетычнай спадчынай продкі-земляробы, чые думкі непарыўна былі звязаны са жнівом, з надзеямі на добры ўраджай, на тое, што сям'я будзе з хлебам. Новы хлеб як само жыццё – Божы дар, без перабольшвання, святыня, тое, да чаго яны ставіліся з вялікай пашанай. І так спрадвеку – ад сяўбы да жніва, ад жніўня да наступнай вясны.

***«Калі не атрымлівалася, не здаваўся, шукаў прычыну і зноў спрабаваў».***

А салома, яна спрадвеку арганічна была ўплецена ў сялянскае жыццё. У руплівага гаспадара нічога не прападзе, а калі яна жытнёвая, то, лічы, золата, што ляжыць пад нагамі. Таму і малацілі жыта не абы як, ведалі, як і куды біць цэпам, каб салому не пашкодзіць. Яе нарыхтоўвалі на корм і подсціл для жывёлы, на іншыя гаспадарчыя патрэбы. Напрыклад, як матэрыял для вырабу розных хатніх прылад, посуду – загадзя адбіралі з абмалочаных снапоў прыдатныя для гэтай справы саломіны.

На працягу стагоддзяў яна была самым танным і даступным будаўнічым матэрыялам. Для страхі падыходзілі так званыя стаўбуны – больш цвёрдая, няломкая салома. Такі дах шмат часу верай і праўдай служыў селяніну. У неўраджайныя гады, у самым безнадзейным выпадку салому здымалі з хаты і зноў малацілі, ашчадна збіраючы рэшткі зерня, якое яшчэ не паспелі абабраць мышы.

Рэзаную салому перамешвалі з глінай і рабілі блокі для сцен. Дыхалася ў такой хаце лёгка, бо захоўваўся аптымальны мікраклімат, якраз дзякуючы саломе: сцены вільгаць у сябе не ўбіралі і лепш трымалі цяпло. У 70-я гады ХХ стагоддзя на Брэсцкім і Гомельскім Палессі былі такія пабудовы, і сёння яшчэ дзе-нідзе яны сустракаюцца.

Майстравітыя гаспадары з прадаўгаватых сцяблін плялі лёгкія, зручныя і надзейныя прадметы хатняга ўжытку – набірушкі, гладышы, скрынкі, сявенькі, бочкі, балеі, куфры ды іншае. Доўгія асеннія і зімовыя вечары – самы час для такой працы.



**Аляксей НЕНАДАВЕЦ: беларуская саламяная спадчына – самая багатая ў свеце, а майстэрства і кемлівасць нашых продкаў выклікаюць захапленне**

Вядомы міфолаг, фалькларыст і літаратуразнавец, доктар філілагічных навук, прафесар Аляксей Ненадавец гаворыць, што самыя светлыя ўспаміны, звязаныя з саломай, асацыіруюцца ў яго якраз з тым часам, калі бацька плёў разнастайныя гаспадарчыя прылады. Гэта адбывалася менавіта ў такія восеньскія ці зімовыя, «доўгія як п'яная песня» вечары. Малая радзіма Ненадаўца – вёска Чухава Пінскага раёна. Памятае, як бацька прыносіў загадзя нарыхтаваныя снапы жытняй саломы, і ўся хата поўнілася духмяным водарам. А ён, малы, спачатку назіраў з цікавасцю, а як крыху падрос, далучыўся да бацькавай справы. Такая вось няхітрая сялянская навука: глядзі і вучыся, а лепш дапамагай, хутчэй засвоіш.

***«Каб не сарваць дамову, бацьку даявлося штовечар па тры капелюшы плесці».***

– У бацькі былі залатыя рукі, прычым з розным матэрыялам працаваў выдатна. Дастаткова яму было раз убачыць – і адразу мог загарэцца, а потым зрабіць многія рэчы. Калі не атрымлівалася, не здаваўся, шукаў прычыну і зноў спрабаваў. Яму было цікава дайсці да ўсяго сваім розумам, – згадвае Аляксей Міхайлавіч. – Ніколі не сядзеў без працы: то нешта пілаваў, то шыў ці выкройваў. Памятаю, нават паліто сабе пашыў. Пры гэтым працаваў у калгасе. А якую мэблю рабіў! Калі б сёння яе пабачылі, то

дзівіліся б вельмі. Розныя прыстасаванні вырабляў, збіраў механізмы, усё гэта выкарыстоўвалася ў гаспадарцы.

Як і той разнастайны посуд, які бацька плёў з саломы. Ён хоць і зручны, танны, але недаўгавечны, бо і мышы часам маглі пагрызці. Падчас бацькавага шчыравання малому здавалася, што ўся хата завалена саломай: нашто яе столькі!? Але не ўся яна выкарыстоўвалася. Вопытны майстра ведаў, менавіта які матэрыял узяць у залежнасці ад яго трываласці, валакністасці і іншых якасцей. І сыну паказваў, як выбіраць салому самую роўную ды гладкую ў пучкі, «ладненькія і не тоўсценькія, усяго па 5–6 саломінак», каб потым было зручна плесці рэчы. Але і гэта яшчэ не ўсё. Бацька клаў салому ў вялікія ліпавыя ночвы, заліваў яе кіпнем. Яна станавілася эластычнай і набывала медзяны колер. Кожную саломіну вылушчваў з верхняга слоя, тады яна блішчэла і набывала сапраўднае сонечнае адценне. Гэту навуку вельмі добра засвоіў маленькі Аляксей: бачыў, як бацька рэзка і спрытна сашморгвае верхні слой, паспрабаваў сам – і адразу да крыві параніў пальцы…

У адзін з такіх зімовых вечароў Міхаіл Аляксеевіч сплёў для сына скрыначку з накрыўкай. Яе вядомы навукоўца беражэ дагэтуль як талісман і добра памятае радасныя дзіцячыя эмоцыі ад татавага падарунка. І сёння ў гарадской кватэры, апроч яе, ашчадна захоўвае яшчэ некалькі дарагіх сэрцу рэчаў з саломы, якія зрабіў бацька. Сярод іх матулін кораб з накрыўкай, дзе лёгка змяшчалася цэлае вядро ягад.

– Памятаю, як асабліва доўга ён выштукоўваў скрынку для збору вішань, – гаворыць Аляксей Міхайлавіч.



Аляксей Ненадавец ашчадна захоўвае рэчы, якія зрабіў бацька

Радок маладых вішанек у садзе яны пасадзілі разам: ён, малы, старанна прытрымліваў кволыя саджанцы, пакуль бацька завіхаўся з лапатай. І надзіва ўсе дрэўцы прыжыліся, ягад хапала сабе, а частку нават ва ўраджайны год прадавалі.

***«Згадаем Міколу Гузікава са Шклова, які ў XIX стагоддзі быў сапраўднай легендай – віртуозна граў на саламяных цымбалках».***

– Спачатку вішні збіралі ў саламяныя карабы для чарніц, а потым маці папрасіла сплесці больш зручныя, – згадвае Аляксей Міхайлавіч. –



Снапоў нажалі-навязалі...

Фота ілюстрацыйнага характару



Брыль – лёгкі практычны галаўны ўбор,
які з задавальненнем носяць і цяпер, асабліва ў спёку

Атрымалася хвацкая пасудзіна накшталт кошыка з бакавымі ручкамі і дадатковымі мацаваннямі з лазы. Надзвычай удала бацька плёў саламяныя гарлачыкі. На жаль, ніводнага не засталося ў маёй калекцыі. Адзін такі ўручыў мне са словамі «памяць табе будзе». Потым я насіў у ім суніцы з лесу.

З саломы ў Чухаве выраблялі картузы – мужчынскія галаўныя ўборы з аколышкам і цвёрдым казырком. А бацька рабіў капелюшы з палямі – брылі. Яны засцерагалі ад сонца не толькі галаву, а і плечы, што, натуральна, больш практычна. Маленькі Аляксей таксама з задавальненнем насіў свой брылёк. Забяспечыў бацька капелюшом і цесця, дзеда Уладака, але той нядоўга ў ім фарсіў. Зяць папярэджваў, што трэба падвязаць пад падбародкам шнурок, які ён спецыяльна уплёў у саламяны выраб, але стары праігнараваў параду. Пайшоў на луг касіць, і калі ўзняўся вецер, брыль сасклізнуў з галавы і лёгка, як птушка, узвіўся ў неба. Дзед Уладак сварыўся на лятучы капялюш, вяскоўцы смяяліся і раілі збегаць дамоў па стрэльбу, каб збіць непаслухмяны брыль трапным стрэлам. Жартавалі так, бо ведалі, што стары – выдатны паляўнічы і рыбак.

– Неяк у вясковым клубе праходзіў конкурс самадзейных калектываў і загадчык установы ўпрасіў бацьку зрабіць 20 картузоў і нават абяцаў добра заплаціць, але сплесці іх трэба было за тыдзень, – расказвае Аляксей Ненадавец. – Каб не сарваць дамову, бацьку давялося штовечар па тры капелюшы плесці ды яшчэ шнурочак да кожнага прымацоўваць, каб у віхурыстай «польцы» тыя капелюшы не паляцелі з галоў артыстаў.

Аднойчы бацька ўзяў яго з сабой на раённы конкурс майстроў традыцыйных народных рамёстваў у мястэчку Лагішын. За калекцыю саламяных вырабаў Міхаілу Аляксеевічу тады ўручылі ганаровую грамату і грашовую прэмію. Сын запомніў, як адна жанчына з непрыхаванай зайздрасцю сказала: «Пашанцавала, чалавеча, тваёй жонцы. З такім посудам на любую працу ісці весела і не сорамна». Тады, згадвае вучоны, ён вельмі заганарыўся бацькам і землякамі, якія стваралі цудоўныя вырабы з саломы. І тым больш пераканаы цяпер, што беларусам ёсць чым ганарыцца:

– Згадаем Міколу Гузікава са Шклова, які ў XIX стагоддзі быў сапраўдай легендай – віртуозна

У Музеі старажытнабеларускай культуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры можна пабачыць разнастайныя даўнія вырабы з прыродных матэрыялаў – саломы, лазы, дрэва





Саламяныя царскія вароты – унікальная беларуская традыцыя, якую аднавіла мастак, народны майстар па саломапляценні Ларыса Лось з Мінска

іграў на саламяных цымбалках. Самародак, якога ніхто не вучыў музычнай грамаце. Славуты польскі скрыпач Ліпіньскі, які іграў у пары з самім Паганіні, лічыў Міколу геніем і папулярызаваў талент нашага земляка, уводзіў яго ў арыстакратычныя салоны. Шклоўскі музыка дэманстраваў сваё майстэрства ў каралеўскіх палацах Еўропы.

Сяляне не толькі посуд і гаспадарчыя прылады выраблялі з саломы, але і стваралі высокамастацкія творы. Перш за ўсё размова ідзе пра саламянае аздабленне царкоўных іканастасаў і абразоў у тэхніцы аб'ёмнага пляцення. У канцы XVIII – пачатку XIX стагоддзя яно было характэрна для вясковых храмаў Палесся, хаця сустракалася і ў іншых рэгіёнах. Пра тое, што такія ўмельцы былі сярод землякоў, Аляксей Ненадавец у свой час даведаўся, збіраючы фальклорны матэрыял у суседняй Дабраслаўцы: распытваў знаёмага лесніка пра мясцовага знахара, які некалі тут жыў, і пачуў ад яго, што ў дабраслаўскай царкве XVII стагоддзя царскія вароты былі таксама сплецены з саломы. А ўжо пазней, калі быў дактарантам тагачаснага Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН, яму давялося на ўласныя вочы пабачыць гэты сапраўдны саламяны цуд.

Унікальныя ўзоры саламяных царскіх варот захаваліся да нашых дзён. Старадаўнюю традыцыю аднавіла народны майстра па саломапляценні, мастак Ларыса Лось (Мінск). У Дзяржаўным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь сёння захоўваюцца адноўленыя Ларысай Мікалаеўнай і яе дачкой Аленай, якая дапамагала ёй у гэтай карпатлівай працы, унікальныя саламяныя вароты з храмаў в. Лемяшэвічы Пінскага і в. Вавулічы Драгічынскага раёнаў Брэстчыны.

## «Саламяны» начальнік

Практычныя палешукі, зрэшты, не толькі яны, рабілі адмысловыя матрацы – сеннікі: палатняны мех набівалі саломай. Ён мог служыць паўгода, а то і да наступнага ўраджаю. Аляксей Ненадавец памятае, як дзед Уладак сцвярджаў: спаць на саломе карысна, яна саграе, стомленае за дзень цела добра адпачывае, а сон лёгкі. «Салома ад жыта, а жыта – святое, бо яно хлеб», – любіў прыгаворваць дзядуля. Праўда, сам аддаваў перавагу пірначу – спаў на пярыне з качынага пуху, а качак ён здабываў на паляванні. Галоўны недахоп саламянага сенніка – ён хутка губляў форму. Таму для яго ніколі не бралі аўсяную салому, яна хутчэй збівалася, выкарыстоўвалі толькі жытнёвую. А калі ўжо вяскоўцы сталі больш заможныя і пачалі купляць матрацы на спружынах, то Міхаіл Аляксеевіч




загарэўся ідэяй мадэрнізаваць сеннік. Прыдумаў вельмі цікавую канструкцыю. Усёй сям’ёй спачатку скруцілі каля сарака саламяных валікаў даўжынёю пад два метры, надзейна звязалі-злучылі іх у своеасаблівы мосцік, а расцягнуўшы на падлозе, атрымалі шыкоўны матрац. Маці пашыла наматрацнік і служыў той цуд па сваім прамым прызначэнні гадоў дваццаць. А суседзі прыходзілі падзівіцца на такі незвычайны матрац.

Плёў Міхаіл Аляксеевіч таксама маты, якімі ўцяплялі хату, з вуліцы замацоўваючы іх паверх вокнаў і дзвярэй. Сціснутая, спрасаваная салома добра ахоўвала жытло ад маразоў і сівернага ветру. Вешалі маты ў хляве, каб скаціна не мерзла. Аберагала салома і маладыя дрэўцы ў садзе ад марозу ды ад зайцоў, якія наведваліся паласавацца карой. Быў у гаспадарцы і саламяны вулей. Пчаліную хатку звычайна рабілі з зеленаватай саломы з-пад недаспелага жыта, яна больш моцная і гнуткая.

– Бацька мог сплесці такі за пару дзён, але ён быў непрактычны, – тлумачыць Аляксей Ненадавец. – У нас меўся, апроч саламянага, яшчэ дубовы вулей. Памятаю, дзедаў брат Сцяпан гаварыў: дубовы вечны, а гэты мышы з’ядуць. Але пахваліў – вулей атрымаўся прыгожы. Тата прынёс неяк з балота два роі дзікіх пчол, але яны не прыжыліся.

Яшчэ адзін цікавы прадмет саламянай спадчыны – чуні-саламяны, якія хлапчуком-падлеткам Аляксей Ненадавец знайшоў неяк на гарышчы дзедавай хаты. Спачатку нават не зразумеў, што гэта. Бабуля растлумачыла: чуні плялі па ўзоры, што паўтараў форму нагі і абутку, на абутак жа іх потым і нацягвалі. Хадзіць у такіх тэпцях не надта зручна, але працаваць зімой было добра. Яшчэ чуні аблівалі вадой. На марозе яны прыхопліваліся лядком і доўга захоўвалі цяпло, вільгаць не прапускалі. Бабуля тады параіла выкінуць гэта «смецце», але ён хацеў аднесці знаходку настаўніку гісторыі – для школьнага музея. Узяўся быў атрэсці патэнцыяльны экспанат




**Здаўна саламяныя павукі аберагалі хату і гаспадара**

ад пылу, як той літаральна рассыпаўся ў руках. Зноў выручыў бацька – сплёў за некалькі вечароў прыгожыя залацістыя «саламяны». Апошні раз родную Чухаўскую школу Аляксей Міхайлавіч наведваў гадоў шэсць таму. Бачыў у школьным музеі і тыя чуні, і іншыя этнаграфічныя матэрыялы пра родны край, якія ён перадаваў землякам пазней.

Прызнаецца, што зноў згадаў сваё дзяцінства і юнацтва. Здаецца, што ўсё жыццё так ці іначай звязана з саломай. Самыя першыя дзіцячыя ўспаміны – як маці брала яго ў поле і ён, зусім яшчэ малы, гуляўся, седзячы ў саламяным карабе, пакуль яна працавала. Падлеткам на канікулах, як многія вясковыя дзеці, імкнуўся зарабіць капейку, працаваў побач з дарослымі. Вострая, калючая, асабліва ячневая, салома набівалася і ў нос, і ў вочы, і пад кашулю. Больш спрытных і старанных брыгадзір мог паставіць сціртаваць салому. Аднойчы так і стаў Аляксей «саламяным» начальнікам.

– З пятага па сёмы клас сцірты ладзіў, а пазней працаваў памочнікам камбайнера – спачатку з бацькам, а потым два гады з дзядзькам Колем, яго малодшым братам, – згадвае навуковец. – Літаральна з поля паехаў здаваць уступныя экзамены ў гомельскі ўніверсітэт: дзень адпрацавалі, ноч адкасілі, падвезлі да хаты, памыўся, пераапрануўся – і ў дарогу.

*«Дзедаў брат Сцяпан гаварыў: дубовы вечны, а гэты мышы з'ядуць».*

З саломай звязана шмат цікавых і павучальных гісторый, якія ён чуў ад бацькоў, аднавяскоўцаў і якія пазней занатоўваў падчас этнаграфічных вылазак у сваім і іншых раёнах Беларусі. У Лельчыцкім на Гомельшчыне вельмі ўразіла вялікая саламяная бочка на 20 пудоў. У такой, гаворыць Аляксей Ненадавец, звычайна захоўвалі збожжа, ставілі яе ў хаце бліжэй да печы. Каб дно часам не вывалілася, бочку ўсталёўвалі на драўляны кругляш ці дошкі.

Падобная саламяная бочка падчас вайны выратавала жыццё яўрэйскай дзяўчынцы. У вёсцы Ботава, што на Піншчыне, кемлівыя гаспадары два гады ў

**На выставе ў Астравецкім цэнтры культуры і творчасці**









**Народныя майстры перадаюць сакрэты саломапляцення моладзі. На здымку: у Доме рамёстваў у аг. Кароўчына, 2023 год**

патаемным месцы хавалі яе ад немцаў. Неяк зімою, калі дзіця паклікалі ў хату памыцца, паесці і пагрэцца, нечакана наведаліся ворагі. Пакуль фашысты заходзілі ў двор, малой загадалі лезці ў бочку – збожжа там амаль не было, а зверху накідалі брудных лахманоў. Няпрошаныя госці аказаліся мадзьярамі. Гаспадары, збялелыя, амаль развіталіся з жыццём і моўчкі чакалі, што будзе далей. Чулі, як гэтыя нелюдзі лютавалі ў навакольных вёсках, пераплюнуўшы нават немцаў. Тыя ж, забраўшы кавалак сала і бохан хлеба, пайшлі з хаты. Гаспадары яшчэ доўга не маглі прамовіць ні слова. І да бочкі не падыходзілі, баяліся, што чужынцы вернуцца, не верылі, што бяда мінавала. Нарэшце наважыліся і, адкінуўшы рыззё, убачылі кранальную карціну: згарнуўшыся калачыкам, малая спала, відаць, ад неймавернага страху праваліўшыся ў глыбокае забыццё.

– Расказвалі, што тая дзяўчына стала ўрачом, пазней з'ехала ў ЗША і прысылала грошы і пасылкі сваім выратавальнікам, – гаворыць мой суразмоўца. – А саламяная бочка яшчэ шмат гадоў служыла гаспадарам.

На маё пытанне, дзе можна было схаваць дзіця зімой, Аляксей Міхайлавіч адказвае: хутчэй за ўсё ў хляве. І згадвае яшчэ адну падобную гісторыю:

– Так сябар майго дзеда выратаваў яўрэя. Пад авечкамі выкапалі яму, зверху паклалі жэрдкі, на іх – салому. А дух ад гэтай жывёлы такі, што ніводная аўчарка след не возьме.

Разважаем пра тое, чаму людзі рызыкавалі жыццём, добра ўсведамляючы, што іх чакала, калі б нехта выдаў.

– Адна бабуля на такое маё пытанне, што вы ж ведалі, фашысты будуць катаваць люта і заб'юць, адказала проста: «А я, Алёша, думала, можа і маім дзецям нехта дапамагае», – гаворыць Аляксей Ненадавец.

***«Важна, што захаванне і развіццё саломапляцення падтрымліваецца на дзяржаўным узроўні: трэба, каб традыцыя жыла, была зацікаўленасць у моладзі».***

Балела сэрца за сваіх, а ратавала чужых. Як адчувала, так і рабіла: простая філасофія звычайнай сялянскай жанчыны.

Такіх жыццёвых «саламяных» гісторый з гадамі ў нашага героя назбіралася шмат. Ёсць сярод іх трагічныя і смешныя, недарэчныя таксама. На

Лунінеччыне фалькларыст пачуў аповед пра «саламяны» пасаг шляхцянкі. Праўда, некаторыя сцвярджалі, што яна не паненка, а звычайная дзяўчына. У вандроўцы па Лельчыцкім краі запісаў яшчэ адну гісторыю пра салому-пасаг. Нейкую шляхцянку ніхто не хацеў браць замуж праз сварлівы характар «дзявухі-векавухі». Але ўсё ж знайшоўся «пан» і для яе. Сквапны бацька нявесты запісаў у пасаг, апроч усяго, два вазы саломы. Пажылі маладжоны разам толькі адну зіму, больш не вытрымаў суджаны, пагрузіў яе рэчы на воз і адправіў да бацькоў. Дома шляхцянка апамяталася – не ўвесь жа пасаг вярнула і падала на былога мужа ў суд, які прысудзіў таму аддаць два вазы жытняй саломы. Але дзе яе ўзяць, новы ўраджай яшчэ чакаць трэба, а суддзя штрафам пагражае. Стары парабак, што жыў у сям'і і быў для іх амаль як родны, параіў зняць старую салому са страхі свірана, якую і так збіраліся перакрыць нанова: «Пан суддзя загадаў вярнуць два вазы жытняй саломы, але ж не ўдакладняў, старой ці новага абмалоту». Так і зрабілі, адвезлі тую салому да саламянай удавы. Разнерваваная шляхцянка зноў у суд падалася. Тут ужо суддзя не вытрымаў, зарагатаў: «Не такі ён дурань, як мне спачатку падалося». І пагадзіўся, што ўсё па закону.

Аляксей Ненадавец лічыў, што гэта гісторыя – чарговая народная выдумка, але пазней знайшоў пацвярджэнне ў архіўных дакументах, што на Убарцкім Палессі, да якога адносіцца якраз і Лельчыцкі рэгіён, насамрэч існавала такая завядзёнка – даваць у пасаг ці як частку пасагу салому…

Так, салома мела важнае значэнне ў жыцці нашых продкаў. Яе выкарыстоўвалі і на корм жывёле, і на падсціл, і як матэрыял для будаўніцтва, стварэння хатніх прылад, і для высокага мастацтва, і ў абрадах.

Аляксей Ненадавец планаваў напісаць пра гэты феномен навукова-папулярны артыкул, але матэрыялу за шмат гадоў сабралася на цэлую кнігу. У 2021 годзе яна выйшла ў выдавецтве «Беларуская навука» ў серыі «Традыцыйны лад жыцця» пад назвай «Залацістыя саломкі снапкі». Гэта не першае яго выданне гэтай серыі. У сваіх кнігах Аляксей Ненадавец расказвае пра народныя промыслы, спеўныя традыцыі, міфалагічную і фальклорную спадчыну беларусаў. Некаторыя з іх, як і згаданая пра салому, напісаны ў суаўтарстве з сынам Ягорам, навуковым супрацоўнікам аддзела народазнаўства Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. І цяпер Аляксей Міхайлавіч працуе над чарговай кнігай, паглыбляецца ў мінулае, каб яшчэ раз асэнсаваць і паказаць неймавернае багацце нашай духоўнай і культурнай спадчыны. І лічыць, што саломапляценне – адна з самых адметных формаў мастацкай традыцыі беларусаў:

– Паступова нашы продкі выдатна засвоілі прыёмы саломапляцення, пад іх майстравітымі рукамі звычайная салома ператваралася не толькі ў танныя і зручныя рэчы, але і ў высокамастацкія творы, – разважае Аляксей Ненадавец. – Многія з іх і сёння не маюць аналагаў у свеце і з'яўляюцца нацыянальным здабыткам нашай краіны. А пасля таго, як беларускае саломапляценне ўключылі ў Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА, яшчэ і сусветным. І важна, што захаванне і развіццё саломапляцення падтрымліваецца на дзяржаўным узроўні: трэба, каб традыцыя жыла, была зацікаўленасць у моладзі.

Сапраўды, у Беларусі ўсе ўмовы для гэтага створаны: дастаткова адукацыйных і культурных устаноў для дзяцей і дарослых, у якіх можна навучыцца саломапляценню. Праводзяцца выставы і фэсты, конкурсы па саломапляценні і майстар-класы. Саламяная спадчына Беларусі – жывая традыцыя, якая мае свой лагічны працяг. Высокамастацкія творы з саломы ствараюць сучасныя народныя майстры Ларыса Лось, Раіса Раманеня, Таісія Агафоненка, Лідзія Главацкая, Тамара Паўлоўская і імногія іншыя. Зробленыя ў рознай тэхніцы, яны ўжо даўно сталі нацыянальным брэндам, візітоўкай Беларусі. Найбольш значныя калекцыі саламяных вырабаў экспануюцца ў музеях краіны і за яе межамі.

Вось такая яна, беларуская салома – сціплая і залатая, звычайная і непаўторная. Як нашы людзі, што далі ёй сусветнае прызнанне. Як само жыццё!

***Ганна МАСЛЯКОВА***
***Фота БЕЛТА, Ягора НЕНАДАЎЦА***
***і з адкрытых крыніц***